Еще одним вариантом разработки сюжета Крысолова в русской литературе 1920-х годов является поэма Г. Шенгели «Искусство» (1926). Г. Шенгели ставит проблему сохранения личности молодого человека в условиях нарастающей диктатуры. Выход видится автору в приобщении людей к культурным ценностям. В этом плане произведение Г. Шенгели полемично по отношению к поэме М. Цветаевой. Новаторством в произведении Г. Шенгели является усиление автором евангельских ассоциаций, что дает возможность говорить о символико-философском характере поэмы.

Тексты А. Грина, М. Цветаевой, Г. Шенгели стали основой для последующих разработок сюжета Крысолова И. Бродским, М. Левитиным, В. Маканиным, братьями Стругацким, А. Тереховым. Таким образом, в 1920-х годах сюжет Крысолова укореняется в русской литературе и впоследствии начинает вращаться в среде русской метатекстуальности.

©ПГУ

## КАНЦЭПТ «БОГ» У СУЧАСНАЙ ПАЭЗІІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЕРШАЎ А. СЫСА)

***В. А. ГЕМБІЦКАЯ,*** **С. М. ЛЯСОВІЧ**

Cognitive interpretation of the concept of God is carried out in the article on the material of Anatol Sys' poems. The distinctive features of the author's representation of the concept correspond to the Christian and pagan outlook

Ключавыя словы: канцэпт, светаўспрыманне, антрапамарфізм, язычніцтва, хрысціянства

Адзін з напрамкаў рэлігійнай філасофіі XX стагоддзя – неапратэстантызм – сцвярджае, што ёсць непасрэдная сувязь паміж самапазнаннем і пазнаннем Бога. Канцэпт «Бог» мае грамадска-палітычныя і культурныя каштоўнасныя сэнсы.

У фальклорных тэкстах канцэпты заўсёды надзелены вызначальнымі ўласцівасцямі. Па іх можна рэканструяваць выгляд Бога, які надзяляецца антрапаморфнымі рысамі (фразеалагічныя адзінкі: як у Бога за плячыма, Божая сляза, Божы палец; песні, звязаныя з народнымі святамі і абрадамі: «…У трэцяе акно сам Бог паглядзеў/ Сам Бог паглядзеў, слязіну ўраніў…», «Сам Бог мяды сыціць, Ілля піва варыць…»). Бог – асоба мужчынскага полу (фразеалагічныя адзінкі Бог бацька, браць Бога за бараду). А архаічнае суаднясенне неба з Богам характэрна і сёння. У міфалагічнай свядомасці неба і зямля, святло і цемра, верх і ніз з'яўляюцца асноўнымі апазіцыямі, на якіх нанізваецца светаўспрыманне [1, с. 667]. Бог прадстаўляе ў культурах верх, знаходзіцца на небе, выступае ўвасабленнем святла.

Даўно ўжо адбылася секулярызацыя культуры, але канцэпт «Бог» з'яўляецца шырока прадстаўленым у сучаснай паэзіі. У сучасных беларускіх вершах Бог таксама надзяляецца антрапаморфнымі рысамі. У А. Сыса: «…Прыснюся праз дзень матулі / не я — шчаслівейшы хтосьці / з Радзімай: буслы, як перлы, / далоні – у сто дарог.../ і ў вышытым строі белым / самы спакроўны Бог…» («Алаіза»). У вершы з нізкі «Песні пра сына» прыродны язычніцкі Бог надзелены чалавечымі рысамі: «Пан Бог злосны, тапоршчыць вусы, / штось няладнае ў яго панстве:/ ах, нябесныя каласы/ долу хіляцца, бы ў паганстве… («Пан Бог злосны, тапоршчыць вусы…»). Язычніцтва акрэслівае ўзаемаадносіны чалавека і прыроды, а хрысціянства разглядае чалавека ў стасунках з грамадствам.

Для А. Сыса прырода – гэта лад і ўпарадкаванасць, асабліва ў вершах («Пан Лес», «Вяпрук», «Чорная быль», «Лес») ён сакралізуе лес, называе яго храмам: «…бо Лес – гэта больш чым лес. / Вам ранілі гострым сэрца, / крывавіць, баліць парэз, / і хочацца толькі смерці, / стрывайце, знайдзіце моц / дайсці, дапаўзці да Лесу, / ён з боскай крыві прарос/ пакутнікам правіць мессу… («Пан Лес»). Не толькі А. Сыс, але і Н. Гілевіч сакралізуе лес: «…У цёмны лес пайду і там / Апошні раз нагаваруся. / Скажу ўсё дрэвам і кустам,/ Хто ёсць я ў роднай Беларусі… («Усё жыццё»). Лес – боская прастора на зямлі, што нагадвае пра язычніцкае ўспрыманне.

Бог як выратавальнік бачыцца неабходным на фоне амаральнасці людзей у вершы «Бажавоўк», дзе таксама спалучаюцца хрысціянскія і паганскія рысы. А. Сыс упэўнены, што Бог прыхільна ставіцца да Беларусі: «…значыць, Бог не пайшоў упрочкі / з Белай / крэўнай / яго Русі. / Бог жыве!..» («Наступніку Уладзіміра Караткевіча»).

Так, творы А. Сыса адлюстроўваюць сінтэз хрысціянскіх характарыстык Бога і народных уяўленняў беларусаў. Бог надзелены антрапаморфнымі рысамі мужчынскага полу. Беларуская сучасная паэзія ўтрымлівае надзею на тое, што Бог не забыўся на Беларусь.

### Літаратура

3. Мифологический словарь / Сост. Е.М. Мелетинский. М.: «Советская энциклопедия». 1991. – 736 с.
4. *Сыс А.* [Electronic resource] / Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка. Electronic data. Мінск, 2000. Mode of access: http://sys.knihi.com/. Date of access: 15.07.2009.
5. *Гілевіч Н.* Бунт непрыкаяннай музы: маленькая анталогія вершаў з газетных палос (1991–2006). СПб.: Невский простор, 2007. – 96 с.